

ГОД МИРА И СОЗИДАНИЯ





ГОД КАЧЕСТВА

МЕТАДЫЧНАЕ АПІСАННЕ

# ВЫСТАВАЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК СРОДАК ПАТРЫЯТЫЧНАГА І ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ

МИНСКАЯ ОБЛАСТЬ

ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ ПА АДУКАЦЫІ
МІНСКАГА АБЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"МІНСКІ АБЛАСНЫ ІНСТЫТУТ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ"

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ
"ЦЭНТР ТВОРЧАСЦІ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ САЛІГОРСКАГА РАЁНА"

# ВЫСТАВАЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК СРОДАК ПАТРЫЯТЫЧНАГА І ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ

МЕТАДЫЧНАЕ АПІСАННЕ

Салігорск 2024

Рэцэнзент:
Н.У. Навагран, метадыст дзяржаўнай установы адукацыі “Вучэбна-метадычны кабінет Салігорскага раёна”

Аўтар-укладальнік:
І.М. Дамалазава, загадчык аддзялення дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”

Рэкамендавана
метадычным саветам дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”
5 снежня 2023 года, пратакол № 2

**Выставачная дзейнасць як сродак патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання падрастаючага пакалення.** Метадычнае апісанне / аўтар-укладальнік І.М. Дамалазава; Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”. − г. Салігорск, 2024 г. − 25 с.

У дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” выставачная дзейнасць з’яўляецца традыцыйнай формай работы з навучэнцамі з выкарыстаннем сучасных інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій.

У дадзеным метадычным апісанні паказана роля выставачнай дзейнасці ў фарміраванні духоўна-маральных каштоўнасцей дзяцей і падлеткаў, вызначаны умовы арганізацыі выставачнай дзейнасці, дадзены метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі выставы выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці, зыходзячы з вопыту работы аддзялення народнай творчасці.

Матэрыял адрасаваны педагагічным работнікам устаноў агульнай, сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

©Дзяржаўная ўстанова
дадатковай адукацыі
“Цэнтр творчасці дзяцей і
моладзі Салігорскага раёна”

**Змест**

Уводзіны .......................................................................................... 3

Выставачная дзейнасць як сродак патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання падрастаючага пакалення .......................................................................................... 5

Заключэнне .......................................................................................... 12

Літаратура .......................................................................................... 15

Дадатак 1 .......................................................................................... 16

Дададак 2 .......................................................................................... 23

Дадатак 3 .......................................................................................... 24

Дадатак 4 .......................................................................................... 25

## Уводзіны

Будучыня роднай Беларусі залежыць ад падрастаючага пакалення: яго каштоўнасных арыенціраў, мыслення і паводзін. Асаблівае значэнне ў выхаванні дзяцей надаецца выхаванню пачуцця патрыятызму, асобы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, у цэнтры якой будзе пачуццё асабістай адказнасці за лёс Радзімы. Любоў да яе фарміруецца паступова ў працэсе назапашвання ведаў аб грамадскім жыцці, прыродзе, народных традыцыях, працы людзей на карысць дзяржавы.

Патрыятычнае выхаванне, з’яўляючыся састаўной часткай агульнага выхаваўчага працэсу, уяўляе сабой сістэматычную і мэтанакіраваную дзейнасць па фарміраванню ў вучняў высокай патрыятычнай свядомасці, пачуцця вернасці сваёй Айчыне, гатоўнасці да выканання грамадзянскіх і канстытуцыйных абавязкаў па абароне Радзімы. Мэта патрыятычнага выхавання – развіццё ў асобы высокай сацыяльнай актыўнасці, грамадзянскай адказнасці, духоўнасці, станаўленне асобы, якая валодае станоўчымі каштоўнасцямі і якасцямі, здольна праявіць іх у стваральным працэсе ў інтарэсах Айчыны.

Сістэма адукацыі арыентавана на забеспячэнне ўмоў для гістарычнай пераемнасці пакаленняў, развіццё нацыянальнай культуры, выхаванне паважлівых і беражлівых адносін да культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа. Выхаванне дзяцей на аснове лепшых народных традыцый разглядаецца як умова захавання этнакультурнай самабытнасці, традыцыйнасці, ментальнасці, нацыянальных каштоўнасцей беларусаў.

Рашэнне дадзенай праблемы немагчыма без глыбокага пазнання традыцый і звычаяў, а таксама актывізацыі педагагічнай дзейнасці па далучэнню падрастаючага пакалення да культурных традыцый.

Культурна-патрыятычны напрамак грамадзянскага выхавання накіраваны на развіццё творчых здольнасцей моладзі праз далучэнне іх да музычнага фальклору, вуснай народнай творчасці, народных святаў, знаёмства са звычаямі і традыцыямі беларускага народа. Эфектыўнай формай працы ў гэтым напрамку з’яўляецца выставачная дзейнасць [2].

Выставачная дзейнасць – адзін з відаў арганізацыйна-метадычнай работы любой адукацыйнай установы. Гэта дэманстрацыя дзіцячых работ, якія ўяўляюць сабой асаблівы спосаб мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, створаны дзецьмі свет, які ўяўляе сабой сінтэз рэальнасці і фантазіі [6].

У 2022 годзе ў дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” адбылося адкрыццё выставы педагогаў і навучэнцаў аддзялення народнай творчасці “Беларускі каляндар”, прысвечанай Году гістарычнай памяці.

Падрыхтоўка і правядзенне дадзенага мерапрыемства было накіравана на вырашэнне наступных задач:

пазнаёміць з гісторыяй узнікнення беларускіх народных святаў, павышаючы пазнавальны і культурны ўзровень навучэнцаў;

сфарміраваць і развіваць цікавасць да творчай дзейнасці ў галіне традыцыйнай творчасці Беларусі;

навучыць навыкам і прыёмам калектыўнай творчай дзейнасці, раскрываючы творчы патэнцыял навучэнцаў;

развіваць уяўленне і фантазію, творчую актыўнасць, ствараючы станоўчы эмацыянальны настрой;

выхоўваць мастацкі і эстэтычны густ;

фарміраваць духоўна-маральныя якасці падрастаючага пакалення, выхоўваць патрыятызм і грамадзянскасць;

выяўляць адораных навучэнцаў у аб’яднаннях па інтарэсах аддзялення народнай творчасці;

прапагандаваць лепшыя дасягненні выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці сярод выхаванцаў цэнтра творчасці, навучэнцаў школ і іншых адукацыйных установ, дарослага насельніцтва раёна;

арганізоўваць супрацоўніцтва з творчымі калектывамі і майстрамі народнай творчасці.

Задачы дадзенай метадычнай распрацоўкі:

паказаць ролю выставачнай дзейнасці ў фарміраванні духоўна-маральных каштоўнасцей дзяцей і падлеткаў;

даць метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі выставы выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці, зыходзячы з вопыту работы аддзялення народнай творчасці.

## Мадэль рэалізацыі творчага патэнцыялу педагогаў і навучэнцаў у працэсе выставачнай дзейнасці



## Выставачная дзейнасць як сродак патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання падрастаючага пакалення

***Патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне вучняў ва ўстанове дадатковай адукацыі***

Патрыятызм – гэта любоў да сваёй радзімы, яе культуры, гісторыі, усіх састаўляючых духоўна-маральную аснову асобы. Духоўна-маральнае выхаванне – гэта садзейнічанне станаўленню моладзі, фарміраванне гуманных каштоўнасцяў, удзел у сацыяльным жыцці, свабодны выбар свайго шляху – гэта свайго роду развіццё патрыятызму ў маладых людзей, любові да сваёй Айчыны.

Яшчэ з найстаражытнейшых часоў патрыятызм разглядаўся вялікімі філосафамі і навукоўцамі ў якасці рухаючай сілы грамадскага развіцця і дзяржаўнай стабільнасці. Самымі раннімі аўтарамі, якія закранаюць патрыятызм у сваіх працах, былі: Арыстоцель, Платон, Сакрат, Цыцэрон. Пазней патрыятызм быў прадметам разважання Ф. Бэкана, Ж.Ж. Русо, Мантэск'е і іншых. Што тычыцца сучаснасці, то на сённяшні дзень не перастае быць актуальнай тэма патрыятызму, якая з кожным годам усё больш пашырае свае межы даследавання [5].

У беларускай сістэме адукацыі ахова і захаванне гістарычнай памяці чырвонай ніццю праходзіць праз змест адукацыйнага працэсу. Гісторыя Беларусі ад першых паселішчаў і Полацкага княства да нашых дзён садзейнічае выпрацоўцы ў вучнеўскай моладзі “імунітэту” супраць чужых ідэалаў і каштоўнасцяў. Беларускія асветнікі Ефрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Францыск Скарына, Сымон Будны – толькі частка вядомых імёнаў, якія праславілі зямлю беларускую і заклалі фундамент нацыянальнай гістарычнай памяці.

Выкарыстанне патэнцыялу гістарычнай спадчыны працуе як на папулярызацыю і развіццё рэгіёнаў, так і дзяржавы ў цэлым, садзейнічае фарміраванню нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, выклікае пачуццё гонару за сваю краіну [4].

У складаных сацыяльна-эканамічных умовах асаблівая роля належыць установам дадатковай адукацыі. Сістэма дадатковай адукацыі дзяцей уяўляе сабой сферу, якая аб'ектыўна аб'ядноўвае ў адзіны працэс выхаванне, навучанне і творчае развіццё асобы дзіцяці. Яна прадугледжвае рознабаковае і своечасовае развіццё дзяцей і моладзі, іх творчых здольнасцяў, творчага патэнцыялу, самарэалізацыі асобы.

Шырокія магчымасці дадатковай адукацыі дазваляюць навучэнцам знаёміцца з самымі рознымі відамі дзейнасці чалавека. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва – напрамкі, якія маюць вялікае значэнне ў духоўным развіцці дзяцей і падлеткаў, у іх патрыятычным і духоўна-маральным выхаванні.

У дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” выставачная дзейнасць з’яўляецца традыцыйнай

формай работы з навучэнцамі. Штогадовыя тэматычныя выставы аддзялення народнай творчасці падтрымліваюць цікавасць і стымулююць творчае самаразвіццё ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, з’яўляючыся важнай падзеяй у жыцці цэнтра творчасці (Мал. 1).



*Мал. 1. Удзел педагогаў і навучэнцаў у адкрыцці выстаў Цэнтра творчасці*

Правядзенне выставы “Беларускі каляндар” садзейнічала выхаванню грамадзянскасці і патрыятызму, фарміраванню духоўна-маральных якасцяў, выяўленню адораных навучэнцаў у аб’яднаннях па інтарэсах аддзялення народнай творчасці. Адкрыццё выставы – прэзентацыя найлепшых дасягненняў выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці сярод навучэнцаў цэнтра творчасці, школ, іншых адукацыйных устаноў, дарослага насельніцтва раёна (Мал. 2).



*Мал. 2. Адкрыццё выставы “Беларускі каляндар”*

***Метадычныя ўмовы арганізацыя выставачнай дзейнасці ў дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”***

Методыка арганізацыі выставы складаецца з сукупнасці метадаў, прыемаў і сродкаў выставачнай дзейнасці, накіраваных на стварэнне выставачнай экспазіцыі, якая адказвае патрабаванням патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Выстава “Беларускі каляндар” у цэнтры творчасці разлічана на дзяцей рознага ўзросту і на дарослую аўдыторыю.

*Умовы для правядзення выставы*

выставачная зала з неабходным абсталяваннем: кубы рознай формы і памеру для размяшчэння работ на гарызантальнай плоскасці, рэйлінгі для вертыкальнай дэманстрацыі пано, карцін і іншых вырабаў;

тэхнічнае абсталяванне для музычнага суправаджэння адкрыцця выставы: калонка для фанаграм, баян, мікрафоны для выканаўцаў беларускіх народных песень;

выбар актуальнай тэмы, якая будзе цікавая як дзецям рознага ўзросту, так і дарослым, з'яўляецца важнай умовай матывацыі для ўдзелу ў выставе;

вывучэнне тэарэтычнай састаўляючай неабходна для творчай інтэрпрэтацыі аўтарскай задумы;

для станоўчага выніку неабходна мэтанакіраваная работа педагогаў і навучэнцаў па стварэнню работ у розных тэхніках выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці на працягу навучальнага года;

распрацоўка сцэнарыя адкрыцця выставы (Дадатак 1);

анонс мерапрыемства ў мясцовых сродках масавай інфармацыі: для інфармавання навучэнцаў, педагогаў цэнтра творчасці, бацькоў і ўсіх жадаючых наведаць выставу, на ўваходзе і на інфармацыйным стэндзе размяшчаюцца афішы з указаннем тэматыкі, месца і часу правядзення выставы.

У мясцовых СМІ змешчаны прэс-рэліз аб адкрыцці і сроках работы выставы, для ганаровых гасцей прыгатаваны запрашальныя білеты. На адкрыццё і закрыццё выставы запрошана адміністрацыя ДУДА “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” і майстры народнай творчасці**;**

падрыхтоўка дыпломаў і памятных сувеніраў: самым актыўным удзельнікам выставы падрыхтаваны дыпломы за арыгінальнае творчае вырашэнне і аўтарскую задуму, а іх бацькам – лісты падзякі. Для наведвальнікаў і ўдзельнікаў конкурсаў на адкрыцці выставы прыгатаваны календары з фатаграфіямі экспанатаў выставы (Дадатак 2).

Падрыхтоўка вучняў да выставы прадугледжвае некалькі этапаў:

*Падрыхтоўчы этап*

Пры выбары тэмы для выставы ўлічвалася тое, што 2022 год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Год гістарычнай памяці – сімвал зараджэння і развіцця народа Беларусі з яго непаўторнымі ментальна-псіхалагічнымі рысамі: дабрынёй, справядлівасцю, патрыятызмам, стойкасцю, мужнасцю. Гістарычная памяць – гэта сувязь часоў і пакаленняў, адданасць Беларусі сваім непарушным традыцыям [1].

Традыцыйнае месца правядзення – выставачная зала цэнтра творчасці.

Работа экспазіцыі выставы “Беларускі каляндар” запланавана на працягу навучальнага году для запрашэння выхаванцаў дзіцячых садоў, навучэнцаў школ і ўстаноў дадатковай адукацыі.

Пры складанні тэматыка-экспазіцыйнага плана, акрамя выбару тэмы, месца і тэрміна правядзення, былі вызначаны:

мэты і задачы правядзення выставы;

кампазіцыйная пабудова выставы: кампазіцыйны цэнтр, прынцып і месца размяшчэння экспанатаў;

тэматыка выставачных работ;

тып выставачных работ і крытэрыі іх адбору;

патрабаванні да афармлення выставачных работ;

дадатковае афармленне выставы: музычнае суправаджэнне (фон), каталог выставачных работ, дадатковая інфармацыя (па тэме выставы або аб аб'яднаннях па інтарэсах), эстэтычныя дапаўненні.

У аб'яднаннях па інтарэсах праведзены выхаваўчыя мерапрыемствы па вывучэнню гісторыі ўзнікнення зімовых, вясновых, летніх і восеньскіх беларускіх традыцыйных святаў. У працэсе вырабу экспанатаў, з навучэнцамі малодшага ўзросту было рэкамендавана выкарыстоўваць калектыўныя формы работы. Выраб калекцыі работ у адной тэхніцы садзейнічае згуртаванню дзіцячага калектыву.

Педагогі і навучэнцы выбралі тэхніку выканання работ, распрацавалі эскізы, падрыхтавалі матэрыялы і інструменты. Навучэнцы старэйшага ўзросту правялі самастойнае даследаванне гісторыі, адметных асаблівасцяў, атрыбутаў абрадавых святаў.

Для творчага ўвасаблення аўтарскай задумы ў работах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога напрамку былі выкарыстаны наступныя метады падрыхтоўчай работы з навучэнцамі, якія папярэднічалі выставачнай дзейнасці:

метад індывідуальнай работы з педагогам дазваляе максімальна ўлічваць магчымасці вучня;

метад групавой работы: навучэнцы вучацца канцэнтраваць увагу, развіваюць камунікацыю паміж сабой;

метад свабоды ў сістэме абмежаванняў фарміруе ў вучня ўменне свядома накіроўваць любую сваю работу, робіць яе дысцыплінаванай, мэтанакіраванай;

метад дыялогу педагога і навучэнца дапамагае навучыцца выказваць свае думкі ў практычнай рабоце;

метад параўнання як шлях актывізацыі мыслення дазваляе навучыць бачыць некалькі варыянтаў рашэння тэмы і сюжэту ва ўспрыманні твораў [5].

Для дэманстрацыі на выставе “Беларускі каляндар” былі адабраны індывідуальныя і калектыўныя работы, а таксама кампазіцыі з некалькіх прадметаў, аб’яднаных адным сюжэтам і тэмай. Работы педагогаў і навучэнцаў выконваліся ў розных тэхніках выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці і раней на выставах не дэманстраваліся.

Крытэрыі адбору выставачных работ:

адлюстраванне тэмы традыцыйных беларускіх святаў;

захаванне народных традыцый;

актуальнасць і практычнае значэнне работы;

арыгінальнае мастацка-вобразнае вырашэнне;

мастацкая каштоўнасць і эстэтычнасць выраба;

правільнае афармленне работы;

якасць выканання, ступень завершанасці работы.

Усе выставачныя работы, якія прайшлі адбор, былі забяспечаны этыкеткамі з наступнымі звесткамі: назва работы, прозвішча, імя, узрост аўтара, тэхніка выканання, назва аб’яднання па інтарэсах, прозвішча, імя, імя па бацьку педагога.

*Афармленне выставы “Беларускі каляндар”*

Уся выставачная экспазіцыя складаецца з чатырох частак: восень, зіма, вясна і лета. Яны візуальна аддзелены адна ад адной з дапамогай колеру. Калекцыя работ, якая адлюстроўвае восеньскія беларускія святы, аформлена драпіроўкай жоўтага колеру. Зімовую частку экспазіцыі аб’ядноўваюць блакітны і сіні колер. Беларуская вясна атаясамліваецца са светла-зялёным і ружовым адценнем. Аранжавае і чырвонае афармленне часткі экспазіцыі, якая знаёміць з традыцыйнымі летнімі святамі, сімвалізуе росквіт роднай прыроды (Дадатак 3).

Кампазіцыйны цэнтр выставы знаходзіцца пасярэдзіне залы насупраць уваходу. Зверху размешчана назва, выкананая ў тэхніцы аб’ёмнай аплікацыі з элементамі беларускага арнаменту. Пад ім – кампазіцыя з дванаццаці фатаграфій, кожная з якіх адлюстроўвае месяц года з беларускай назвай і адпаведнае яму традыцыйнае свята. Фатаграфіі размешчаны кругам ў выглядзе вялікага цыферблата: дванаццаць гадзін – дванаццаць месяцаў у годзе. У цэнтры – работа навучэнцаў народнай студыі “Жытнёвы каласок” у тэхніцы вышыўкі крыжом, якая сімвалізуе гадавы цыкл (чатыры пары года) з традыцыйнымі беларускімі сімваламі (Мал. 3).



*Мал. 3. Кампазіцыйны цэнтр выставы*


*Мал. 4. Экспазіцыя першага плана*


*Мал. 5. Экспазіцыя другога плана*

Афармленне выставы “Беларускі каляндар” ажыццяўлялася з улікам кампазіцыйных правілаў, якія абагульняюць шматвяковы вопыт стварэння мастацкіх твораў у жывапісе, скульптуры, архітэктуры, графіцы, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве:

правілы сіметрыі, якія вынікаюць з пластыкі будовы чалавечага цела і мноства іншых прыродных формаў, якія ўстанаўліваюць закон гармоніі прапорцыі, частак і цэлага арганізма;

правілы раўнавагі – спалучэнні процілеглых бакоў выявы, роўнавялікіх па масах;

правілы статыкі і дынамікі (спакою і руху) у пластычным рашэнні кампазіцыі;

правілы рытму – заканамернага чаргавання вялікіх і малых формаў; руху і спакою, кантраснага і прыглушанага, святла і ценю;

правілы перспектывы ў дачыненні да розных кампазіцыйных рашэнняў – па ілюзорнай перспектыве, прамавугольнай (артаганальнай), паветранай;

“залатое сячэнне” і ордэр як заканамерныя дзяленні ў архітэктуры;

маштаб як мера памяншэння ці павелічэнні па стаўленні да натуральнай велічыні;

стылявое адзінства ў ансамблі – у спалучэнні некалькіх відаў мастацтва;

вертыкалі і гарызанталі як пастаянныя восі ў адносінах да ўсіх іншых напрамкаў [3].

Кожная з чатырох частак выставы аб’ядноўвае экспанаты першага і другога плана. Экспазіцыя першага плана (на вертыкальнай паверхні) пабудавана па прынцыпе асіметрыі (Мал. 4). Экспанаты размяшчаюцца свабодна з захаваннем неабходнага адзінства і раўнавагі, ствараючы адчуванне раўнамернай, лагічна апраўданай запоўненасці паверхні. Самыя выразныя аб’екты размяшчаюцца ў цэнтры, задаючы тон астатнім работам. Пры дапамозе асіметрыі дасягаецца эфект дынамізму, нечаканасць ракурсаў, разбурэнне звычных стэрэатыпаў, шматварыянтнасць рашэнняў, якія ажыўляюць кампазіцыю.

Экспанаты другога плана размяшчаюцца на кубах рознага памеру і формы (на гарызантальных паверхнях) (Мал. 5). Асноўныя прынцыпы размяшчэння:

кожны экспанат добра праглядаецца, невялікія работы размяшчаюцца на пярэднім плане, вялікія – на заднім (Мал. 6);

некалькі экспанатаў аб'ядноўваюцца па тэматыцы, сюжэце, тэхніцы і матэрыялах выканання для стварэння адзінай вобразнай экспазіцыі;

кожная пара года, як і ў экспазіцыі першага плана, аддзяляецца адна ад адной з дапамогай колеру драпіроўкі;

ручнікі і паясы ў тэхніцы традыцыйнага беларускага ткацтва і вышыўкі аб'ядноўваюць гарызантальныя экспазіцыі (Мал. 7).



*Мал. 6. Размяшчэнне экспанатаў на гарызантальнай паверхні*



*Мал. 7. Традыцыйныя беларускія ручнікі і паясы*

Каля ўваходу ў выставачную залу на асобным століку размяшчаецца "Кніга водгукаў", каб наведвальнікі маглі пакінуць свае заўвагі, водгукі, пажаданні, словы падзякі (Мал. 8).

*Распрацоўка сцэнарыя адкрыцця выставы "Беларускі каляндар"*

Педагогі аддзялення народнай творчасці разам з навучэнцамі займаюцца пошукам інфармацыі па тэме выставы, выкарыстоўваючы літаратуру з бібліятэкі і інтэрнет-крыніц. Загадчык аддзялення аб'ядноўвае сабраны матэрыял у адзінае цэлае. Культарганізатар рыхтуе гульнёвую праграму, выкарыстоўваючы традыцыйныя беларускія народныя гульні, загадкі, прыказкі і прымаўкі. Педагог аддзялення мастацкай самадзейнасці разам з навучэнцамі рыхтуе музычныя нумары, гукааператар забяспечвае гукавое суправаджэнне адкрыцця выставы (падбірае музычныя тэмы, забяспечвае работу музычнай апаратуры).




*Мал. 8. "Кніга водгукаў" выставачнай залы Цэнтра творчасці*

*Вынікі правядзення і рэкамендацыі па арганізацыі выставы "Беларускі каляндар"*

Для падвядзення вынікаў і вызначэння перспектыў на будучыню, кіраўнікі ўсіх аб'яднанняў па інтарэсах праводзяць узнагароджанне сваіх навучэнцаў – удзельнікаў выставы з мэтай стварэння сітуацыі поспеху для кожнага дзіцяці. Педагогі запрашаюць класных кіраўнікоў і аднакласнікаў удзельнікаў выставы, праводзяць для іх экскурсію і знаёмяць з дасягненнямі вучняў у выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці.



*Мал. 9. Выступленне вакальнага калектыву “Родны напеў”*




*Мал. 10. Інфармацыя аб мерапыемстве на сайце Цэнтра творчасці*



*Мал. 11. Запіс уражанняў і пажаданняў наведвальнікаў выставы у “Кнізе водгукаў”*

У выніку ўдзелу ў выставе аддзялення народнай творчасці “Беларускі каляндар”, навучэнцы:

асвоілі гісторыю ўзнікнення беларускіх народных святаў;

навучыліся знаходзіць арыгінальныя аўтарскія рашэнні;

сфарміравалі навыкі планавання будучых вынікаў;

атрымалі вопыт у вырашэнні творчых праблемных сітуацый;

набылі навыкі дыялагічных зносін у выніку сумеснай дзейнасці;

асвоілі асновы кампазіцыйнай пабудовы, прынцыпы размяшчэння элементаў экспазіцыі;

навучыліся выдзяляць у экспазіцыі найбольш важныя і выразныя элементы;

набылі навыкі аналізу атрыманых вынікаў.

Для якаснай і эфектыўнай арганізацыі выставы неабходна:

у кожным аб’яднанні па інтарэсах правесці конкурс па адбору лепшых работ;

адкрыццё выставы пажадана дапоўніць выступленнямі вакальных і тэатральных творчых калектываў адукацыйнай установы з рэпертуарам, які адпавядае тэматыцы (Мал. 9);

запрасіць на адкрыццё выставы сродкі масавай інфармацыі для асвятлення мерапрыемства і інфармавання насельніцтва раёна аб месцы і сроках правядзення (Дадатак 4);

інфармацыю аб мерапрыемстве, відэа і фотаматэрыялы размясціць на сайце ўстановы адукацыі (Мал. 10);

выкарыстоўваць кнігу водгукаў – абавязковы атрыбут для рэфлексіі ўдзельнікаў і наведвальнікаў выставы (Мал. 11);

у працэсе работы выставачнай экспазіцыі арганізаваць экскурсійнае абслугоўванне, каб наведвальнікі, якія не прымалі ўдзел у адкрыцці, атрымалі неабходную інфармацыю, якая адлюстроўвае канцэпцыю выставы.

## Заключэнне

Разглядаючы выхаванне як неад’емную частку адукацыйнага працэсу, трэба сказаць, што ў ім могуць выкарыстоўвацца розныя інструменты і метады. Аднак вельмі важную ролю адыгрывае мастацтва як інструмент, які валодае вялікай сілай ідэйна-эмацыйнага ўздзеяння. Па меркаванні аднаго з вядомых савецкіх педагогаў У.А. Сухамлінскага, “сіла і эфектыўнасць патрыятычнага выхавання вызначаюцца тым, як глыбока ідэя Радзімы авалодвае асобай, наколькі ярка чалавек бачыць свет і самога сябе вачыма патрыёта”. Мастацтва можа і павінна выступаць у якасці асноўнай крыніцы і носьбіта ідэі Радзімы, абуджаць у чалавека пачуцці патрыятызму і грамадзянскай адказнасці.

Патрыятычнае выхаванне вызначаецца шырокім спектрам культурных здабыткаў грамадства, у якім жыве і функцыяніруе асоба. У апошнія гады прыкметна павысілася цікавасць да рэалізацыі адукацыйнага і выхаваўчага патэнцыялу выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у сувязі з ростам разумення ў сучасным грамадстве значэння вывучэння гісторыі Радзімы. Сёння патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення патрабуе пошуку новых форм і метадаў, заснаваных на традыцыйных маральных каштоўнасцях, да якіх адносяцца любоў да сваёй Айчыны, грамадзянскасць, чалавечая прыстойнасць.

Веды аб культуры, гісторыі, вобразы прыроды роднага краю, захаваныя ў дзіцячай памяці, суправаджаюць пасталелых дзяцей усё жыццё. Заняткі ў аб’яднанні па інтарэсах, у адрозненне ад школьных урокаў, даюць магчымасць эфектыўна вырашаць многія вучэбна-выхаваўчыя задачы за кошт рэалізацыі шырокага спектра форм і метадаў навучання. Заняткі выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасцю дазваляюць дзіцяці набыць устойлівыя патрэбы ў спазнанні і творчасці, максімальна рэалізаваць сябе, самавызначыцца прафесійна і асобасна.

Важна разумець, што пакаленне, якое нарадзілася ў незалежнай Беларусі, нясе асаблівую адказнасць за развіццё грамадства, пераемнасць пакаленняў, росквіт Радзімы. Яно павінна праяўляць патрыятызм сваімі справамі, перамогамі ў працы, спорце і творчасці, навуковых дасягненнях, імкнучыся быць дастойнымі прадаўжальнікамі тых, каму ў страшныя гады Вялікай Айчыннай вайны прыйшлося абараняць кожную пядзю роднай зямлі.

Удзел у выставах дае шырокую свабоду для дзіцячай творчасці, выхоўваючы і навучаючы дзяцей сродкамі выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў сістэме дадатковай адукацыі.

Выстава дзіцячай творчасці – гэта глыбокая інтэграцыя індывідуальных дасягненняў вучняў, сацыяльнага заказу бацькоў, а таксама выніку дзейнасці педагогаў агульнаадукацыйных арганізацый, устаноў культуры і дадатковай адукацыі.

Выставачная дзейнасць – эфектыўны інструмент патрыятычнага выхавання, асабліва ў выпадку выбару тэматыкі, звязанай з фальклорам роднага краю.



*Мал. 12. Творчыя работы навучэнцаў, прысвечаныя вясновым святам*



*Мал. 13. Зімовыя беларускія святы*



*Мал. 14. Экспазіцыя з работамі у тэхніках “кераміка” і “роспіс па шкле”*

Беларускі нацыянальны фальклор – адзін з самых багатых у славянскім свеце. Ён насычаны педагагічным вопытам і народнай мудрасцю. Талерантнасць, цярпімасць, дабрадзейнасць, як традыцыйныя хрысціянскія дабрачыннасці, паступова сталі адметнымі рысамі беларусаў. Больш за тое, яны суседнічаюць з такімі якасцямі, як асабістая годнасць, мэтанакіраванасць, актыўнасць. Фальклор з выхаваўчым зместам, бытавыя традыцыі, святы, беларуская класічная літаратура – гэта тыя паняцці, якія аказваюць вялікі ўплыў на фарміраванне нацыянальнага характару [3].

На сённяшні дзень неадкладнай з’яўляецца патрэбнасць у грамадзянах, якія адрозніваюцца нестандартным мысленнем, прыўносяць новы змест у сацыяльнае, культурнае, вытворчае жыццё, умеюць ставіць і вырашаць перспектыўныя заданні ў кантэксце праектавання будучыні – гэта значыць, у неардынарных творчых асобах. Навучанне выяўленчаму мастацтву можа стаць сродкам развіцця і выхавання патрыятычных пачуццяў вучняў пры ўмове, калі будзе ажыццяўляцца па дакладна пабудаванай методыцы, змяшчаць цікавы і пазнавальны матэрыял, уключаць розныя формы і метады работы, у тым ліку і выставачную дзейнасць.

Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне з’яўляецца вельмі важным і значным кампанентам у працэсе фарміравання ўсебакова развітай, гарманічнай асобы. Паколькі без фарміравання ў чалавеку маральных ідэалаў, пачуцця любові да Радзімы, імкнення да міру, без выхавання ў ім пачуцця адказнасці не толькі за сваё жыццё, але і за лёсы іншых людзей, народа немагчыма паўнавартаснае развіццё дзяржавы.

Выставачная дзейнасць у дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” з’яўляецца неад’емнай часткай навучання і выхавання навучэнцаў, аказвае дабратворны ўплыў на развіццё эстэтычнага густу, садзейнічае развіццю гарманічнай асобы, адраджэнню традыцый, пошуку новых магчымасцяў у рэалізацыі мэты.

У працэсе ўдзелу ў выставе “Беларускі каляндар”, навучэнцы і педагогі аддзялення народнай творчасці самастойна вывучылі традыцыі і звычаі беларусаў, каб творча інтэрпрэтаваць іх у сваіх работах. Перад імі стаяла задача – з дапамогай традыцыйных і сучасных тэхнік паказаць адметныя асаблівасці

правядзення зімовых, вясновых, летніх і восеньскіх святаў каляндарнага году (Мал. 12, 13, 14).

Даследчая дзейнасць дапамагла больш дэталёва вывучыць беларускі фальклор і глыбей зразумець характар, звычкі і перавагі нашага народа. Сумесная работа ў некаторых аб'яднаннях па інтарэсах садзейнічала згуртаванню дзіцячага калектыву і выхаванню ўзаемадапамогі. Самастойнае планаванне дзейнасці спрыяла развіццю творчай актыўнасці і мэтанакіраванасці.

Кожны ўдзельнік выставы дакрануўся да вытокаў беларускіх народных святаў, перадаўшы ў сваіх работах мудрасць, павагу, любоў да Радзімы, назапашаныя папярэднімі пакаленнямі. Яны атрымалі стымул для далейшай творчай дзейнасці і самавызначэння. Навучэнцы-гледачы ўбачылі сваіх сяброў з другога боку, атрымалі стымул паспрабаваць свае сілы ў цікавай для сябе вобласці выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

Правядзенне выставы "Беларускі каляндар" аддзялення народнай творчасці садзейнічала не толькі развіццю творчых здольнасцяў, але і фарміраванню ўменняў ставіць задачы і дасягаць мэты. Навучэнцам аб'яднанняў па інтарэсах і іх педагогам была дадзена магчымасць выйсці за рамкі навучальнага працэсу, рэалізаваць аўтарскую задуму, вынесці свой твор на суд шырокага кола гледачоў і атрымаць водгук. А прызнанне поспеху вучня – паказчык прафесіяналізму педагога.

## Літаратура

1. Аванесова, Г.А. Культурно-досуговая деятельность : теория и практика организации / Г. А. Авеносова. – М. : Аспект пресс, 2015. – 236 с.
2. Бердышев, С. Н. Организация выставочной деятельности: учебное пособие / С. Н. Бердышев. – М. : Дашков и К, 2010. – 228 с.
3. Дейнека, А. А. Учитесь рисовать / А. А. Дейнека. – М. : Академия художеств СССР, 1961. – 239 с.
4. Евладова, Е.Б. Дополнительное образование детей. Учебное пособие для студентов / Е.Б. Евладова. – М. : ГИЦ ВЛАДОС, 2002. – 256 с.
5. Топилина, С. А. Патриотическое воспитание в системе дополнительного образования детей и подростков / С. А. Топилина // Актуальные исследования. – 2021. – №27 (54). – С. 52-54.

## Інфармацыйныя рэсурсы

1. Дзермант А. Год исторической памяти – символ зарождения и развития белорусского народа [Электронный ресурс]. – А. Дзермант. – Режим доступа : https://www.sb.by/articles/2022-y-god-istoricheskoy-pamyati.html. – Дата доступа : 18.10.2022.
2. Игнатенко В.А. Формирование гражданственности и патриотизма в молодежной среде [Электронный ресурс]. – В. А. Игнатенко. Режим доступа : https://docviewer.yandex.by/view. – Дата доступа : 19.10.2022.
3. Мурашко Н.В. Роль белорусского фольклора в патриотическом воспитании дошкольников [Электронный ресурс]. – Н.В. Мурашко. Режим доступа : https://sad10soligorsk.schools.by/pages/rol-belorusskogo-folklora-v-patrioticheskom-vospitanii-doshkolnikov. – Дата доступа : 21.10.2022.
4. Роль историко-культурного наследия Беларуси в формировании гражданственности и патриотизма [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://part.gov.by/6293-20210616-edinyj-den-informirovaniya. – Дата доступа : 21.10.2022.
5. Темирбулатова Р. М. Конкурсно-выставочная деятельность в творческом развитии учащихся [Электронный ресурс]. – Р. М. Темирбулатова. Режим доступа : https://nsportal.ru/kultura/izobrazitelnoeiskusstvo/library/2015/12/18/informatsionnyy-pedagogicheskiy-proekt-konkursno. – Дата доступа : 19.10.2022.
6. Шкеле Н. В. Выставочная деятельность в учреждении дополнительного образования детей. Приёмы и методы создания выставок [Электронный ресурс]. – Н. В. Шкеле. Режим доступа : https://nsportal.ru/kultura/izobrazitelnoeiskusstvo/library/2015/12/01/vystavochnaya-deyatelnost-v-uchrezhdenii. – Дата доступа : 18.10.2022.

**Дадатак 1**

## Сцэнарый цырымоніі адкрыцця выставы дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Беларускі каляндар»

Мэты:

– выклікаць у навучэнцаў, гасцей станоўчы эмацыянальны водгук ад сустрэчы з дзіцячай мастацкай творчасцю;

– садзейнічаць развіццю эстэтычных адносін да навакольнага асяроддзя, мастацкага густу, спрыяць праяўленню творчасці, станаўленню асобы навучэнцаў, выкарыстоўваючы лепшыя ўзоры дэкаратыўна-прыкладной творчасці;

– фарміраваць у навучэнцаў маральныя ўяўленні (добрыя адносіны да людзей, здольнасць перажываць, спачуваць адзін аднаму);

– выхоўваць патрыятычныя пачуцці любові да Радзімы, роднага краю, пачуцця гонару за народнае мастацтва, якое дайшло да нашых часоў, і фармираваць адчуванне дачынення навучэнцаў да традыцыйнай спадчыны.

Удзельнікі: навучэнцы і педагогі аддзялення народнай творчасці дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”, вакальны калектыў народнай песні “Родны напеў”, бацькі.

Месца правядзення: выставачная зала.

Афармленне: экспазіцыя з творчымі работамі навучэнцаў, афіша-запрашэнне на адкрыццё выставы, каляндар-сувенір.

Ход мерапрыемства

*Гучыць народная беларуская музыка XV ст. у выкананні гурта «Стары Ольса»*

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай
Купала Я.

Вядучы: Добры дзень, шаноўныя педагогі, госці, рабяты! Кожная выстава – гэта заўсёды адкрыццё, адкрыццё міра прыгажосці і творчасці. Сёння мы адчыняем яшчэ адны дзверы ў свет дзіцячай творчасці і майстэрства. На цырымонію адкрыцця выставы дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Беларускі каляндар” прыйшлі госці:

1. Міхаіл Бруй, майстар па кераміке Салігорскага раёна.
2. Алена Сцешыц, майстар вышыўкі і ткацтва.
3. Наталля Скрыдлеўская, майстар па вырабу лялек Слуцкага раёна.



Мал. 15. Выступленне вакальнага калектыву “Родны напеў”

Са словамі прывітання да вас звяртаецца Русаковіч У.І., намеснік дырэктара Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.

*(прывітальнае слова, адкрыццё выставы)*

Вядучы: Дарагія сябры! Выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Беларускі каляндар” лічыцца адкрытай. Вас прыйшлі павітаць удзельнікі вакальнага калектыву народнай песні “Родны напеў”, педагог Шыловіч А.Л. Песня “Калі ласка”, сл. и муз. народныя (Мал. 15).

*(выступленне)*





Мал. 16. Загадчык аддзяленнем Дамалазава І.М. з навучэнкай Цэнтра творчасці

Вядучы: Мы з вамі жывем на дзіўнай зямлі, дзе існуюць свае звычаі, традыцыі, сваё мастацтва. Каштоўнасць народнага мастацтва ў тым, што захоўваючы агульныя традыцыі, кожны з майстроў уносіць нешта сваё, новае. Уладзімір Караткевіч лічыў, што “народная творчасць наогул, а беларуская народная творчасць у прыватнасці – гэта мора, якое хавае ў сабе незлічоныя скарбы. Толькі трэба ўмець гэтыя скарбы дастаць”.

Слова прадастаўляецца Дамалазавай І.М., загадчыку аддзяленнем народнай творчасці (Мал. 16):



Мал. 17. Імправізаваны гадзіннік у цэнтры экспазіцыі

“Сёння мы з вамі адкрылі выставу дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Беларускі каляндар”. Яна прысвечана традыцыйным беларускім святам, тым, якія святкаваліся шмат гадоў назад, але і сёння не забыты, і вашы бацькі, бабулі і дзядулі захоўваюць даўнія традыцыі і перадаюць іх наступным пакаленням. Перад вамі гадзіннік, які сімвалізуе каляндарны год. У годзе 12 месяцаў, а ў гадзінніку 12 гадзін (Мал. 17):

Першы месяц года – студзень (январь), ад слова “студзёны”, характарызуе халодную пару года, другі месяц – люты (февраль), азначае самыя халодныя, лютыя маразы, трэці месяц – сакавік (март), ад слова “сок”, у гэтую пару сок пачынае цячы з дрэў, чацвёрты месяц – красавік (апрель), ад слова “красавац”, у гэтым месяцы з’яўляюцца першыя краскі-кветкі, пяты месяц – май, доўгі час называўся “травень”, бо зямля пачынала пакрывацца зялёнай травой, шосты месяц – чэрвень (июнь), у гэтым месяцы спеюць некаторыя ягады, яны набываюць чырвоны колер, сёмы месяц – ліпень (июль), ад слова “ліпа”, якая цвіце менавіта ў гэтым месяцы, восьмы месяц – жнівень (август), калі пачынаюць жаць жыта, дзявяты месяц – верасень (сентябрь), у гэтым месяцы цвіце расліна пад назваю “верас”, дзясяты месяц – кастрычнік (октябрь), раней у гэты час сяляне трапалі лён і кастрыца разлятялася па полі, адзінаццаты месяц – лістапад

(ноябрь), месяц, калі з дрэваўападае апошняе лісце, апошні, дванаццаты месяц – снежань (декабрь), ад слова “снег”.

А зараз мы пачнем прагляд нашай выставы, да якой мы рыхтаваліся цэлы год. У ёй прынялі ўдзел педагогі і навучэнцы аддзялення народнай творчасці. Выстава налічвае больш за 370 работ у розных тэхніках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Экспазіцыя складаецца з чатырох частак па колькасці пор года: восень, зіма, вясна, лета. У розныя поры года беларусы святкавалі розныя святы. Зараз мы даведаемся, як добра вы гэтыя святы ведаеце.

Першая пара года – восень, таму што з яе пачынаецца вучэбны год.

Якія восеньскія беларускія святы вы ведаеце?

*(Пакроў, Багач, Уздвіжанне, Дзяды).*

Малайцы! Зараз вам даецца магчымасць удзельнічаць у гульнях, выканаць некалькі творчых заданняў.

Вядучы: Песня “Восеньскае жніво”, выконвае вакальны калектыў народнай песні “Родны напеў” (Мал. 18).

*(выконваецца вакальны нумар)*

Вядучы: Ёсць такое свята ў беларускім народным календары, як Багач. У садзе паспелі яблыкі, а ў полі збажына. Гэта свята звязана са зборам ураджаю, да яго далучаецца і звычай «талака» – гэта значыць “усе разам”. У народзе кажуць: багач з агарода прагнаў ды ў гумно загнаў! Свята ўраджаю мы адзначаем і зараз, называецца яно Дажынкі (Мал. 19).



*Мал. 18. Песня “Восеньскае жніво”*

Адкажыце, калі ласка, на мае пытанні:

1. Б’юць яго цапамі,
   Рэжуць нажамі,
   Затое яго і лупяць,
   Але яго любяць. *(Хлеб)*

Сапраўды, гэта хлеб. А хлеб – усяму галава. Хлеб выпякаюць з зерня. Зерне – гэта скарб, у ім цяпло сонечнага агню, шчодрасць дажджавой вады, сілы пладароднай зямлі і праца чалавека. Каб вырасціць яго, трэба прыкласці шмат намаганняў.

2. Славен край наш беларускі ёй здаўна,
   Частка розных страў яна.
   І зімой, і летнім часам
   На яе мы вельмі ласы. *(Бульба)*



*Мал. 19. Гутарка пра традыцыйныя восеньскія беларускія святы*

Так, гэта наша любімая бульбачка. Хто ж з беларусаў яе не любіць? Праўду я кажу? А якія стравы гатуюць з бульбы, ведаеце? (аладкі, бульба ў мундзіры, зразы, дзеруны, бульбяную кашу, дранікі, клёцкі, салянікі і г.д).

**Гульня “Стравы з бульбы”**

Хай той запляскае ў ладкі-

Хто любіць з бульбы аладкі.
А за ім па парадку -
Хто любіць зразы і бабку!
Хто клёцкі, бульбяную кашу, салянікі,
А потым, хто любіць дранікі!

Вядучы: Наступная пара года – зіма. Якія зімовыя беларускія святы вы ведаеце?

*(Раство, Каляды, Хрышчэнне).*

Вядучы: Песня “Калядная”, вакальны калектыў народнай песні “Родны напеў” (Мал. 20).

*(выконваецца вакальны нумар)*

Вядучы: У нас сёння цёпла і ўтульна, а на двары – зіма, якая вядзе адлік вечнага кругазвароту. З яе пачынаецца каляндарны цыкл беларускіх святаў і абрадаў. А самае цікавае, самае вясёлае і працяглае зімовае свята – гэта… Як вы думаеце? *(Каляды)*

Правільна, малайцы. Як кажуць беларусы: надыйшлі Калядкі – бліны ды аладкі. Калядкі – добрыя святкі. Хто любіць на Калядкі ласавацца блінцамі?... А ці ведаеце вы, сябры, з якіх прадуктаў гатуюць блінцы? (адказ) А зараз мы і паглядзім! Я буду вам прадукты называць, а вы адказваць, трэба яны для прыгатавання блінцоў – “так” ці “не”. Калі трэба, гучна хлопаем, калі не – гучна топаем! (Мал. 21).



*Мал. 20. Песня “Калядная”*



*Мал. 21. Гульня “Так – не”*

**Гульня “Так – не”**

- парное малако;
- курынае яйка;
- крупа манная;
- капуста качанная;
- салены агурок;
- мясны студзень;
- цукар ды соль;
- белая фасоль;
- масла таплёнае;
- рыба салёная;
- лаўровы ліст;
- кітайскі рыс;
- чарнасліў і разынкі;
- шакаладны лукум;
- перац балгарскі;
- соус італьянскі.

Малайцы, вось і прыгатавалі разам смачныя блінцы!

Вядучы: За зімой наступае вясна. Якія вясновыя беларускія святы вы ведаеце?

*(Масленіца, Гуканне вясны, Саракі, Благавешчанне, Вербная нядзеля, Вялікдзень, Радаўніца).*

Вядучы: Песня “Гукаем вясну”, вакальны калектыў народнай песні “Родны напеў” (Мал. 22).

*(выконваецца вакальны нумар)*


*Мал. 22. Песня “Гукаем вясну”*

Вядучы: Ну вось і прайшлі Каляды. Сонца павярнулася на лета, а зіма – на мароз. І да вясны ўжо не так далёка стала. Хутка – Масленка! Яна зіму канчае, а вясну пачынае. Святкаванне Масленкі прыпадае часцей за ўсё на пачатак вясны. Любімае свята ў народзе – і малых, і старых. Цэлы тыдзень усе гуляюць, спяваюць, ходзяць у госці, катаюцца на конях, ласуюцца блінцамі. Любілі на Масленку і загадкі адгадваць. Давайце і мы з вамі паспрабуем (Мал. 23):

1. У кутку – барада на кійку? *(мятла).*
2. Не звер, а махнатае, не звер, а з вушамі? *(шапка-вушанка).*
3. На кургане, на вургале стаіць курачка з сяргамі *(авёс).*
4. Без кораня, а расце *(камень).*
5. Лысы конь цераз вароты глядзіць *(месяц).*
6. На полі Ярох рассыпаў гарох, а стала світаць – няма чаго збіраць *(неба,зоркі).*
7. Каціцца па небе падушка – не звер, не птушка, не агонь, не вада. Што гэта? *(сонца).*
8. Месяц убачыў – не забраў, сонца ўстала – падабрала (раса).


*Мал. 23. Загадкі пра вясновыя святы беларусаў*

Малайцы! Усе загадкі адгадалі! А яшчэ на Масленку вельмі любілі з горак з’язджаць.

Сябры, адкажыце, калі ласка!

Снега для горак вам хапіла спаўна? *(адказ)*

З горак вы хутка з’яджалі? *( адказ)*

Зараз паглядзім!

**Гульня “ З гары – на гору!”**

Падніміце рукі ўгору і па маёй камандзе з’язджаем уніз – садзімся на корткі. Я кажу: “З гары – вы садзіцеся!”. Я кажу: “На гору – вы ўстаеце!” Будзьце ўважлівыя, я вас буду блытаць!

Вядучы: А самая любімая пара года – лета. Якія летнія беларускія святы вы ведаеце?

*(Тройца, Купалле, Яблычны, Мядовы і Арэхавы спас).*

Вядучы: Песня “Купалінка”, вакальны калектыў народнай песні “Родны напеў” (Мал. 24).

*(выконваецца вакальны нумар)*

Вядучы: Лета! Самая чаканая пара: ні табе хатніх заданняў, ні школы! Час адпачынку, знаёмстваў і неверагодных сустрэч! Сустрэч з найпрыгажэйшымі народнымі святамі і абрадамі! І першае ў гэтым радзе – свята Тройца. Яно прыпадае на канец вясны ці пачатак лета. Адзін з прыгожых абрадаў гэтай пары – “завіванне касы”. У гэты дзень дзяўчаты ідуць у лес, звязваюць верхавіны дзвюх невялікіх бяроз і загадваюць жаданне, звычайна на жаніхоў. А праз тыдзень трэба зноў прыйсці да гэтых бяроз. Калі “каса” расплялася – загаданае споўніцца, а калі не расплялася – не быць у гэтым годзе ў пары.

**Гульня “Запляці касу”**

Дзяўчаты, у каго доўгія валасы, выходзьце, калі ласка. Давайце і мы з вамі “заўём касу”. Дзяўчаты, бярыцеся за стужкі адной рукою, другою – за спіну і пад музыку – пачынаем! Стужкі не адпускаць! (Мал. 25).

*(па камандзе ўдзельніцы “плятуць косы”, пакуль гучыць музыка).*

Вядучы: Годзе! Давайце пабачым, чыя ж каса лепшая і даўжэйшая!

*(параўноўваюць косы)*

Дзякуй вам, вось гэта каса атрымалася даўжэйшая. Апладысменты нашым дзяўчатам. А ваша прыгажэйшая! Дзякуй вам вялікі!

Прыгожае свята Тройца, але я заўсёды чакаю Купальскую ноч! Хто ведае, калі святкуецца гэтае свята?

*(з 6 на 7 ліпеня)*

Купалле – гэта даўняя мара беларусаў знайсці папараць-кветку. Хлопцы і дзяўчаты на беразе ракі за вёскай распальвалі вогнішча, скакалі цераз яго, жартавалі, а потым ішлі шукаць папараць-кветку. А хто з вас хадзіў шукаць папараць-кветку? Знайшлі? Не засмучайцеся! Калі-небудзь у сваім жыцці вы абавязкова адшукаеце яе!

Вось і скончылася наша сустрэча. Жадаем, каб шчасце вас не мінала, каб наўкол яшчэ лепей стала! Каб не спыняўся вечнага жыцця круг! Каб мацнеў ваш дух! Дружна жывіце, край свой любіце, звычаі свае паважайце!

Зараз я запрашаю вас на прагляд работ педагогаў і навучэнцаў аддзялення народнай творчасці. Вы можаце з ўважліва разгледзець экспанаты выставы, зрабіць фотаздымкі на памяць і напісаць пажаданні у “Кнігу водгукаў”. Дзякуй за ўвагу!



*Мал. 24. Песня “Купалінка”*



*Мал. 25. Гульня “Запляці касу”*

## Літаратура


1. Барыс, С. В. Сцежкамі дзядоў : народны быт беларусаў / С. В. Барыс. – Мн. : Беларуская навука, 2015 – 295 с.
2. Верещагина, А. В. Праздники, обряды и таинства в жизни христиан Беларуси / А. В. Верещагина. – Мн. : Белорусская наука, 2009. – 232 с.
3. Карскі, Я. Беларусы / Я. Карскі. уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун ; навук. рэд. А. Мальдзіс ; прадм. Я. Янушкевіча і К. Цвіркі. – Мн. : Беларускі кнігазбор, 2001. – 640 с.
4. Максимов, А. Л. Народные праздники и обряды русских, украинцев и беларусов. ч.1 / А.Л. Максимов. – М. : Велигор, 2014. – 155 с.
5. Навагродскі, Т. А. [і інш.] Этналогія Беларусі : традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве. Вучэб.-метад. дапаможнік / Т. А. Навагродскі [і інш.]. – Мн., БДУ, 2009. – 335 с
6. Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мн. : Беларуская энцыклапедыя, 1997. – 296 с.
7. Титовец, А. Традиционная культура белорусов во времени и пространстве / А. Титовец, Е. Фурсова, Т. Тяпкова. – Мн. : Беларуская навука, 2013. – С. 80-93. – 579 с.


## Інфармацыйныя рэсурсы


1. Абрады і традыцыі Беларусі [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://vetliva.by/belarus/istoriya-i-kultura/traditions/. – Дата доступа : 18.10.2022.
2. Глушкова, М. Самые интересные белорусские обычаи, которые практикуют сегодня [Электронный ресурс] / М. Глушкова. – Режим доступа : https://knife.media/veski/. Дата доступа : 10.11.2022.
3. Обряды и обычаи белорусов [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа : 28.10.2022.
4. Обрядовый календарь Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://pda.ekskursii.by/?Obryadovyj_kalendari_Belarusi. – Дата доступа : 24.10.2022.
5. Панасюк А.Л. Интересные традиции белорусского народа [Электронный ресурс] / А. Л. Панасюк. – Режим доступа : https://ys67grodno.schools.by/pages/interesnye-traditsii-belorusskogo-naroda. – Дата доступа : 08.11.2022.
6. Традиции и обычаи [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://probelarus.by/belarus/information/tradition.html. – Дата доступа : 12.11.2022.
7. Традиции и праздники Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://problr.by/tradiczii-i-prazdniki-belarusi.html. – Дата доступа : 18.10.2022.

**Дадатак 2**


Сувеніры на адкрыццё выставы
«Беларускі каляндар»
Беларускі каляндар
2022

**Дадатак 3**


Экспазіцыя выставы
“Беларускі каляндар”
Зімовыя святы
Вясновыя святы
Летнія святы
Восеньскія святы

**Дадатак 4**


Асвятленне адкрыцця выставы "Беларускі каляндар"
у сродках масавай інфармацыі
ГОД ИСТОРИЧЕСКОЙ ПАМЯТИ
Богатые традиции наших предков – в современном мире
Открытие выставки «Беларускі каляндар»
ГОД 2022 ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ
СОЛИГОРСКТУР
ул. Козлова 26
23-20-06
23-20-05

# Выставачная дзейнасць як сродак патрыятычнага
# і духоўна-маральнага выхавання падрастаючага пакалення

Складальнік:
Дамалазава Ірына Міхайлаўна

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
"Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна"

223710, Мінская вобласць
г. Салігорск, вул. Леніна, д. 57
тэл.: 8(017) 238414
ctdim@edus.by